**140.** Прачытайце верш. Які настрой у ім перадаецца?

**Вось дык спорт**

Калі ты, крот,
так любіш спорт,
ідзі на поле
ці на корт.
А то парыў
увесь гарод
за ноч:
устанавіў рэкорд.

*С. Валодзька.*




Спішыце. Вызначце тып скланення назоўнікаў.

❖ Падкрэсліце ў назоўніках літары, правапіс якіх трэба правяраць.

## Назоўнікі 1-га скланення, іх канчаткі

**141.** Прачытайце назоўнікі. Да якога тыпу скланення яны адносяцца? Вызначце аснову ў кожным назоўніку. Назавіце апошні зычны асновы.

Мама, вышыня, бабуля, гара, рака, краіна, шырыня, песня, раніца, мука́, нага, каса́, нара, вольха.

Запішыце назоўнікі ў чатыры слупкі па ўзоры.

| Узор: | аснова на цвёрды зычны | аснова на мяккі зычны | аснова на зацвярдзелы зычны | аснова на *г, к, х* |
|---|---|---|---|---|
| | *ліса* | *вышыня* | *гара* | *рака* |
| | … | … | … | … |



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**142.** Разгледзьце табліцу. Параўнайце канчаткі назоўнікаў 1-га скланення ў розных склонах.

| Склон | Аснова | | | |
|---|---|---|---|---|
| | на цвёрды зычны | на мяккі зычны | на зацвярдзелы зычны | на *г, к, х* |
| **Н.** | *ліс* а | *бабул* я | *гар* а | *рак* а |
| **Р.** | *ліс* ы | *бабул* і | *гар* ы | *рак* і |
| **Д.** | *ліс* е | *бабул* і | *гар* ы | *рац* э |
| **В.** | *ліс* у | *бабул* ю | *гар* у | *рак* у |
| **Т.** | *ліс* ой (-ою) | *бабул* яй (-яю) | *гар* ой (-ою) | *рак* ой (-ою) |
| **М.** | *(пры) ліс* е | *(пры) бабул* і | *(на) гар* ы | *(у) рац* э |

У якіх склонах назоўнікі 1-га скланення маюць аднолькавыя канчаткі? У якім склоне назоўнікі маюць два варыянты канчаткаў? У формах якога назоўніка ў корані адбываецца чаргаванне ***к—ц***?

Вусна праскланяйце назоўнікі *каса, песня, нара, муќа*. Выкарыстайце ўзор скланення слоў, прапанаваны ў табліцы (*каса* → *ліса, песня* → *бабуля, нара* → *гара, муќа* → *рака*).

**Канчатак назоўніка залежыць ад націску і ад таго, на які гук заканчваецца аснова.**

**143.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

1. Адвага гарады бярэ. 2. Бой адвагу любіць.

Спішыце. Знайдзіце ў прыказках назоўнік 1-га скланення. Вызначце склон гэтага назоўніка ў кожнай з прыказак. Абазначце ў ім канчаткі.

**ву́ліца**

**144.** Прачытайце тэкст. Падзеі якога часу апісваюцца ў ім? Чаму сабака пайшоў за байцамі? Як ён дапамагаў ім у барацьбе з ворагамі?

## Адважны

Гэта было ў час наступлення. **Мы ішлі па вуліцы адной вёскі.** Да мяне прывязаўся вялікі сабака. Чаму ён выбраў менавіта мяне? Ды таму, што я першы кінуў яму кавалак хлеба. Думаў, што сабака правядзе нас да аселіцы і вернецца. Але ён не адстаў, пайшоў разам з намі.

**Звер прыжыўся ў нашай роце.** Мы назвалі яго Адважны. **Ён навучыўся адрозніваць сваіх ад фашыстаў, хадзіў на баявую ахову.** Адважны не раз выратоўваў салдат ад смерці. *(Паводле І. Муравейкі.)*





Правообладатель Акадэмія адукацыі

**асе́ліца** — месца вакол паселішча

Выпішыце выдзеленыя сказы, падкрэсліце назоўнікі 1-га скланення. Вызначце іх склон, абазначце канчаткі.

❖ Якія выпадкі выратавання людзей жывёламі вы ведаеце? Пры неабходнасці запытайцеся пра гэта ў старэйшых або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

**145.** Да якога скланення адносіцца назоўнік *школа*? Далучыце яго да прапанаваных дзеясловаў. Выкарыстайце, калі трэба, прыназоўнікі.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| дзякуем … | | | | |
| падышоў … | | *каля* | | |
| спыніўся … | → | *да* | → | **школа** |
| працуе … | | *па* | | |
| ганарымся … | | *у* | | |
| сумуем … | | | | |

Запішыце спалучэнні слоў, якія атрымаліся. Выдзеліце канчаткі ў розных формах слова *школа*. Вызначце яго склон.

Узор. *Дзякуем* (ч а м у?) *школ*[е] *(Д.)*, …

З адным спалучэннем слоў на выбар вусна складзіце сказ.

**146.** Прачытайце. Пастаўце словы ў дужках у тую ж форму, што і выдзеленае слова.

1. Няма смачнейшай **вадзіцы**, як з роднай *(крыніца)*. 2. Гаспадарлівы ні **сцюжы**, ні *(спёка)* не баіцца. 3. **Яду́** на заўтра адкладзі, а *(справа)* сёння зрабі.

4. Гультай за **работу** — мазоль за *(рука)*. 5. Рыбка ў **рацэ**, ды не ў *(рука)*. 6. Бусел глядзіць на **ваду**, а ўглядаецца пад *(вада)*.

Запішыце прыказкі. Вызначце склон назоўнікаў 1-га скланення. Абазначце ў іх канчаткі.

## Назоўны, родны і вінавальны склоны

**147.** Прачытайце спалучэнні слоў і сказы. Знайдзіце ў іх назоўнікі. Да якога тыпу скланення яны адносяцца?

Прыбегла казуля.
падрыхтавалі для казулі
пачаставалі казулю

Пачалася завіруха.
гулялі пасля завірухі
люблю завіруху

Вызначце склон назоўнікаў і назавіце канчаткі.

Якія канчаткі маюць назоўнікі 1-га скланення ў назоўным склоне? У родным склоне? У вінавальным склоне?

Назоўнікі 1-га скланення ў назоўным склоне маюць канчаткі ***-а, -я***; у родным склоне — ***-ы, -і***; у вінавальным склоне — ***-у, -ю***.

**148.** Прачытайце загадку. З літар, што «схаваліся» на малюнку, складзіце адгадку.

З галінк.. на галінк..
скача, як для пацех..,
спрытна грыбы збірае,
лузгае арэхі.
*У. Карызна.*






Правообладатель Акадэмія адукацыі

Спішыце загадку. Дапішыце ў словы патрэбныя канчаткі. Вызначце склон назоўнікаў 1-га скланення. Абазначце ў іх канчаткі.

Запішыце назоўнік-адгадку. Вызначце яго скланенне. Утварыце формы роднага і вінавальнага склонаў гэтага назоўніка.

### *Творчая хвілінка*

Дзе ў Беларусі знаходзіцца Музей вавёркі? Што там можна ўбачыць? Пры неабходнасці знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

**149.** Складзіце спалучэнні слоў па схемах і запішыце іх.

| Дзеяслоў + назоўнік у Р. с. | Дзеяслоў + назоўнік у В. с. |
|---|---|
| жартаваць з → *(дзяўчынка)*, *(сястрычка)*, *(Тамара)*, *(Каця)* | даглядаць → *(унучка)*, *(яблыня)*, *(пасека)*, *(жывёла)* |

З адным спалучэннем слоў на выбар прыдумайце сказ.

**Будзьце ўважлівыя!**

| у беларускай мове | у рускай мове |
|---|---|
| жартаваць з унучкі | подшучивать над внучкой |
| даглядаць бабулю | ухаживать за бабушкой |

**150.** Прачытайце тэкст. Назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбным склоне. Як утвараюцца сняжынкі? Дайце назву тэксту.

На тваю *(рукавічка)* ле́гла *(сняжынка)*. Табе стала цікава: адкуль прыляцела маленькая ледзяная

*(зорачка)*? Можа, з царства самой Снежнай *(каралева)*?



**Вучоныя даказалі, што сняжынкі ўтвараюцца не з *(вада)*, а з *(па́ра)*.** Яе ўтрымлівае паветра. ***(Пара)* падымаецца высока ў неба.** Там яна ператвараецца ў маленькія льдзінкі. Ільдзінкі сутыкаюцца і чапляюцца адна за адну. **Потым яны падаюць на *(зямля)* прыгожымі зорачкамі. Менавіта такая *(зорачка)* легла табе на *(далонька)*.** *(Па матэрыялах часопіса «Вясёлка».)*

Запішыце выдзеленыя сказы. Вызначце склон назоўнікаў адзіночнага ліку 1-га скланення. Абазначце ў іх канчаткі.

**Рм** Вусна апішыце сняжынкі. Выкарыстайце патрэбныя прыметнікі з прапанаваных: *белыя, мяккія, прыгожыя, цёплыя, іскрыстыя, дужыя, лёгкія, шырокія, бязважкія, маленькія, крохкія.*

**151.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. Змяніце, калі неабходна, формы слоў.

1) Аліна, са, вярталася, школа; 2) дзяўчынка, з, спусцілася, горка, і, сваю, на, вуліца, выйшла; 3) яшчэ, убачыла, здалёк, Аліна, бабуля; 4) яна, дарожка, каля, падмятала, хата; 5) унучка, да, падбегла, бабуля, абняла, яе, за, шыя.

Вызначце склон назоўнікаў 1-га скланення. Абазначце ў іх канчаткі.

❖ Падкрэсліце дзейнік і выказнік у сказах з аднароднымі членамі.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

# Давальны і месны склоны

**152.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце склон назоўнікаў, назавіце іх канчаткі.

радаваўся (ч а м у?) размове
падзякаваў (к а м у?) бабулі
парадаваўся (ч а м у?) сустрэчы
дараваў (к а м у?) дачцэ́

пачуў (у ч ы м?) у размове
сумаваў (п а к і м?) па бабулі
быў (н а ч ы м?) на сустрэчы
засумаваў (п а к і м?) па дачцэ́

Якія канчаткі маюць назоўнікі 1-га скланення ў давальным і месным склонах?

**153.** Прачытайце назоўнікі 1-га скланення. Вызначце ў іх аснову. Ахарактарызуйце апошні гук асновы.

Крама, песня, вёска, рака, нага, нара.

Пастаўце назоўнікі ў форму давальнага склону па ўзоры.

| | | |
|---|---|---|
| *крама — краме* | *песня — песні* | *нага — назе* |
| сцяна — ... | вішня — ... | страха — ... |
| лямпа — ... | зямля — ... | кніга — ... |
| *вёска — вёсцы* | *рака — рацэ* | *нара — нары* |
| коска — ... | рука — ... | сястра — ... |
| міска — ... | мука — ... | дача — ... |

Запішыце пары слоў. Выдзеліце канчаткі ў назоўніках у давальным склоне.

Назоўнікі 1-га скланення ў давальным і месным склонах маюць аднолькавыя канчаткі *-е, -і, -ы, -э.*

| Назоўнікі з асновай | | Канчаткі |
|---|---|---|
| на ***цвёрды*** зычны і на ***г, х*** | | *-е (лямпе, страсе,назе)* |
| на ***мяккі*** зычны | | *-і (песні)* |
| на ***зацвярдзелы*** зычны | | *-ы (нары)* |
| на ***к*** | пад націскам | *-э (рацэ)* |
| | не пад націскам | *-ы (місцы)* |

Апошнія зычныя асновы могуць **чаргавацца:** ***г → з, х → с, к → ц.***

**154.** Прачытайце верш. Назавіце ў ім словы з памяншальна-ласкальным значэннем. Чаму аўтар часта выкарыстоўвае іх?

**Ксюша**

Ксюшачка, Ксюшачка,
вось табе падушачка.
Дарагой маёй дзяўчынцы
**падбіралі** па пярынцы
тыя гусі белыя,
што па лузе бегалі.
Ты заснеш, ты **заснеш**
на сваёй падушачцы.
І не думай у сне
з гусаком падужацца.

*П. Панчанка.*





Правообладатель Акадэмія адукацыі

Выпішыце выдзеленыя дзеясловы разам з назоўнікамі адзіночнага ліку, якія залежаць ад іх. Пастаўце пытанні ад дзеясловаў да назоўнікаў. Вызначце склон гэтых назоўнікаў, выдзеліце канчаткі.

Узор. *Падбіралі* (п а ч ы м?) *па пярынц*[*ы*] *(М.)*, …

**155.** Прачытайце тэкст. Назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбную форму. Якімі суседзямі былі сарока і сава? Чаму?

### Суседзі

Сарока і сава — суседзі.

**Жывуць яны на адной *(сасна)*: сава ў дупле, а сарока на *(верхавіна)*.**

Увечары, калі сарока спаць кладзецца, сава прачынаецца. **Яна крычыць усю ноч, не дае спаць *(суседка)*.**

— Я ж табе адплачу, — злуецца сарока. — Хай толькі дзень настане.

Уранку сава залазіць у дупло. **Тады сарока ўзнімае такі шум, што беднай *(сава)* хоць вушы затыкай.**

І такая калатня ў іх кожны дзень і кожную ноч.

— Ну і суседзі! — смяюцца жыхары лесу. *(Паводле В. Хомчанкі.)*

**калатня́** — спрэчка, якая суправаджаецца крыкам, шумам

Запішыце выдзеленыя сказы. Знайдзіце ў іх назоўнікі 1-га скланення. Вызначце іх склон, абазначце канчаткі.

**Рм** Раскажыце, як паводзяць сябе добрыя суседзі.

**156.** Прачытайце верш. Якую песню спявалі хвалі для чайкі?

### Чайка і хвалі



Хвалі чайку калыхалі,
песню птушцы *(на)*пявалі:
— Люлі-люлі, *(за)*сынай
і прысні марскі наш край,
параходы, караблі,
люлі, люленькі-люлі.
Чайка слухала — *(не)*спала:
рыбу *(ў)*хвалях *(вы)*глядала.

*Н. Галіноўская.*

Спішыце, раскрываючы дужкі. Вызначце склон назоўнікаў адзіночнага ліку 1-га скланення. Выдзеліце ў іх канчаткі.

## Творны склон

**157.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце склон назоўнікаў 1-га скланення, назавіце іх канчаткі.

| | |
|---|---|
| сустрэўся з сястрой | сустрэўся з сястрою |
| ганаруся краінай | ганаруся краінаю |
| захапіліся гульнёй | захапіліся гульнёю |
| пачаставала дыняй | пачаставала дыняю |

Якія варыянты канчаткаў маюць назоўнікі 1-га скланення ў творным склоне? Якія канчаткі пішуцца пад націскам? Якія канчаткі пішуцца не пад націскам?



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**158.** Прачытайце назоўнікі 1-га скланення. Вызначце ў іх аснову. Ахарактарызуйце апошні гук асновы.

Сасна, каша, скрыня, зямля.

Пастаўце назоўнікі ў форму творнага склону па ўзоры.

*Сасна* — *сасной, сасною*; старана — ...; навіна́ — ... .
*Радзіма* — *Радзімай, Радзімаю*; балерына — ...; каша — ... .
*Чысціня* — *чысцінёй, чысцінёю*; зямля — ...; дабрыня — ... .
*Песня* — *песняй, песняю*; гаспадыня — ...; скрыня — ... .

Запішыце словы. Выдзеліце канчаткі ў назоўніках у творным склоне.

**балеры́на**

Назоўнікі 1-га скланення ў творным склоне маюць варыянты канчаткаў ***-ой (-ою), -ёй (-ёю), -ай (-аю), -яй (-яю)***.

| Назоўнікі з асновай | Канчаткі |
|---|---|
| на ***цвёрды*** і ***зацвярдзелы*** зычны | пад націскам ***-ой (-ою)*** (*кар*[*ой*], *кар*[*ою*])<br>не пад націскам ***-ай (-аю)*** (*каш*[*ай*], *каш*[*аю*]) |
| на ***мяккі*** зычны | пад націскам ***-ёй (-ёю)*** (*зямл*[*ёй*], *зямл*[*ёю*])<br>не пад націскам ***-яй (-яю)*** (*скрын*[*яй*], *скрын*[*яю*]) |

**159.** Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам у патрэбнай форме. Пра што марыць Ірына? Над чым яна працуе?



### Балерына

**На пальчыках ходзіць Ірына.**
**Ёй хочацца стаць ... .**
А кот-балетмайстар вурчыць:
— Вучыся нячутна хадзіць,
як Мурка, суседка мая,
мур-мур... і, вядома, як я.

*Н. Галіноўская.*

Знайдзіце ў тэксце назоўнікі 1-га скланення. Утварыце ад іх форму творнага склону. Выкарыстайце варыянты канчаткаў.

Спішыце выдзеленыя сказы. Вызначце склон назоўнікаў 1-га скланення, абазначце канчаткі.

**Рм** Раскажыце, чаму вы хочаце навучыцца ў будучым.

**160.** Прачытайце тэкст. Назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбную форму. Вызначце іх склон.

На кухні прыемна пахла ежай. Мама з *(Таня)* прыгатавалі вячэру. Пасярод стала ўзвышалася вялікая міска з *(бульба)*. На талерцы ляжалі бутэрброды з *(каўбаса)* з *(рыба)*. Яны былі ўпрыгожаны *(пятрушка)* зялёнай *(цыбуля)*.

Спішыце, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. Абазначце канчаткі ў назоўніках 1-га скланення ў творным склоне.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**161.** Прачытайце. Пастаўце назоўнікі ў дужках у форму творнага склону.

1. Не спяшайся языком, а спяшайся *(справа)*. 2. За *(вада)* і саломінка паплыве. 3. З добрай *(песня)* жыць весялей. 4. Лепей хлеб з *(вада)*, як пірог і мёд з *(бяда)*. 5. І пад белаю *(кашуля)* душа бывае брудная. 6. Хадзі простай *(дарога)*, то не заблудзіш.

Запішыце прыказкі. Абазначце канчаткі ў назоўніках 1-га скланення ў творным склоне.

## Назоўнікі 2-га скланення, іх канчаткі

**162.** Прачытайце назоўнікі. Да якога тыпу скланення яны адносяцца? Вызначце аснову ў кожным назоўніку. Назавіце апошні зычны асновы.

Горад, вучань, лось, гай, палец, дождж, ранак, нос, госць, конь, чай, плывец, мантаж, ельнік, пірог, мох, сон, дом, прамень, рог, урач.

**плыве́ц**

Запішыце назоўнікі ў чатыры слупкі па ўзоры.

Узор:

| аснова на цвёрды зычны | аснова на мяккі зычны | аснова на зацвярдзелы зычны | аснова на *г, к, х* |
|---|---|---|---|
| *горад* | *вучань* | *палец* | *ранак* |
| … | … | … | … |